Падтрымай "Вясну" на PATREON

За абразлівыя каментары ў адрас чыноўнікаў і Лукашэнкі мужчыну пакаралі трыма гадамі “хіміі” і вялікім штрафам

01.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні, дыфамацыя



Судовая зала. Ілюстратыўнае фота

Як стала вядома праваабаронцам "Вясны", у судзе Савецкага раёна г. Мінска 29 кастрычніка агучылі прысуд па крымінальнай справе ў дачыненні да палітзняволенага Вадзіма Гіля, якога вінавацілі ў абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК) і абразе прэзідэнта (ч. 1 арт. 368 КК).

Справу разглядала суддзя **Марына Фёдарава**, бок дзяржаўнага абвінавачвання прадстаўляла **Анастасія Маліко**. Пацярпелымі па справе былі прызнаныя начальнік мінскага АМАПу **Дзмітрый Балаба**, міліцыянт-кіроўца **Уладзіслаў Шукайла**, старшыня пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў **Андрэй Савіных** і пракурорка **Аліна Касьянчык**. Ад іх у суд паступілі заявы аб немагчымасці ўдзелу ў працэсе.

Паводле абвінавачвання, маючы намер на публічную абразу прадстаўнікоў ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых паўнамоцтваў, і Аляксандра Лукашэнкі, пасля прагляду публікацый Вадзім Гіль пакінуў шэраг каментароў у чаце тэлеграм-канала “Кулуары KYKY” у перыяд з красавіка па чэрвень 2021 году, чым публічна абразіў іх:

- 10 красавіка 2021 года – у адрас старшыні Савета Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **Наталлі Качанавай** і ў адрас былога міністра аховы здароўя, а ў цяперашні час старшыні Гродзенскага аблвыканкаму **Уладзіміра Караніка**;
- 14 красавіка і 15 красавіка 2021 года – у адрас старшыні цэнтрвыбаркама **Лідзіі Ярмошынай**;
- 20 красавіка 2021 года – у адрас міліцыянта-кіроўцы ўзвода аператыўна-баявога прызначэння АМАП УУС Брэсцкага аблвыканкама **Уладзіслава Шукайлы**;
- 23 красавіка 2021 года – у адрас намесніка міністра МУС **Мікалая Карпенкова**;
- 27 красавіка – у адрас старшыні цэнтральнай камісіі па выбарах прэзідэнта **Лідзіі Ярмошынай**;
- 19 траўня – у адрас старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага схода **Наталлі Качанавай**;
- 23 траўня двойчы пакінуў абразлівыя каментары ў адрас **Лукашэнкі**;
- 26 траўня зноў двойчы пакінуў каментары ў адрас **Лукашэнкі**;
- 1 чэрвеня ізноў у адрас **Лукашэнкі**;
- 2 чэрвеня пакінуў два каментары ў адрас старшага памочніка пракурора Фрунзенскага раёна Мінска **Аліны Касьянчык**;
- 13 чэрвеня – у адрас камандзіра АМАП ГУУС Мінгарвыканкама **Дзмітрыя Балабы**;
- 24 чэрвеня – у адрас старшыні пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу **Андрэя Савіных.**

Па словах пракуроркі, абвінавачаны разлічваў на наступнае ўспрыманне іншымі асобамі абразлівай інфармацыі, усведамляючы публічны і зневажальны характар свайго выказвання з мэтай прычынення шкоды аўтарытэту дзяржаўнай улады, чым здзейсніў злачынствы па ч. 1 арт. 368 і арт. 369 Крымінальнага кодэкса.

Агалошванне прад’яўленых абвінавачванняў Гілю заняло 30 хвілін.

Вадзім Гіль прызнаў віну поўнасцю. Ён распавёў, што не быў падпісаны на тэлеграм-канал “Кулуары KYKY”, але чытаў там навіны і пакідаў каментары; разумеў, што каментары могуць быць абразлівымі, іх можа пабачыць неабмежаваная колькасць людзей. Патлумачыў, што той перыяд быў даволі цяжкі перыяд для яго асабіста, ён паверыў той інфармацыі, што была змешчана ў тэлеграм-канале, і такім чынам выказаў сваю крыўду. У здзейсненым раскайваецца, зрабіў для сябе адпаведныя высновы.

Вадзім Гіль быў затрыманы 27 ліпеня 2021 года, з той пары ўтрымліваўся пад вартай.

У спрэчках бакоў пракурорка прасіла суд прызнаць Вадзіма Гіля вінаватым і прызначыць яму паводле ч. 1 арт. 368 КК пакаранне ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам на два гады, а па арт. 369 КК – абмежаванне волі са штрафам у памеры 300 базавых велічынь. Шляхам паглынання менш строгага пакарання больш строгім канчаткова прасіла прызначыць пакаранне ў выглядзе **абмежавання волі з накіраваннем** у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу **тэрмінам на тры гады са штрафам 300 б.в.**,

мабільны тэлефон – канфіскаваць у даход дзяржавы, а таксама задаволіць заяўлены Балабам пазоў **аб кампенсацыі маральнай шкоды ў памеры 1000 рублёў**, сыходзячы з прынцыпаў разумнасці і справядлівасці.

Менавіта такі прысуд і вынес суд, а пазоў аб кампенсацыі маральнай шкоды задаволіў у поўным аб'ёме. Вадзім Гіль быў вызвалены з-пад варты ў зале суда на час абскарджвання прысуду.

Твитнуть







Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



Рэферэндум 2022





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY